зараз няма. Чым хутчэй з'явіцца разуменне важнасці імправізацыі ў прафесіяналізме сучаснага музыканта, таго, што без заняткаў імправізацыяй нельга гаварыць аб эфектыўным практычным навучанні, тым хутчэй айчынная сістэма музычнай адукацыі пераадолее цяжкасці, стане адпаведнай сусветнай канцэпцыі музычнага выхавання.

**Л.Ф.Голікава**, *дацэнт*

# ЦЫКЛ МУЗЫЧНЫХ ГІСТОРЫКА-АНАЛІТЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН У МЕЖАХ СТАНДАРТАЎ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ "СУСВЕТНАЯ І АЙЧЫННАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА"

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У наш час, калі ў Рэспубліцы Беларусь праводзіцца рэформа вышэйшай адукацыі, увядзенне адукацыйных стандартаў, прызначэнне якіх у выпрацоўцы аптымальных патрабаванняў да ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў, вельмі актуальнае.

Характэрнай асаблівасцю стандартаў вышэйшай адукацыі, адрозненнем іх ад традыцыйных праграм з'яўляецца тое, што, з аднаго боку, яны становяцца фундаментам, на якім могуць паспяхова рэалізоўвацца педагагічныя канцэпцыі і ідэі. З другога боку, адукацыйныя стандарты (у чым заключаецца адзін з важнейшых прынцыпаў стандартызацыі ў сферы адукацыі) арыентаваны на канчатковы вынік вучэбнага працэсу і адкрываюць мноства магчымасцей плённай творчай дзейнасці навучэнца і выкладчыка.

Спецыяльнасць "сусветная і айчынная мастацкая культура" прадугледжвае падрыхтоўку спецыяліста-мастацтвазнаўцы шырокага профілю, прыстасаванага як да мастацка-творчай, арганізацыйна-кіраўніцкай, навукова-даследчай работы, так і да педагагічнай дзейнасці.

Веды і ўменні будучага спецыяліста дадзенай спецыяльнасці, акрэсленыя межамі дзяржаўнага стандарта, фарміруюцца з некалькіх буйных блокаў дысцыплін: гуманітарных, сацыяльных, агульнанавуковых і агульнапрафесійных, спецыяльных, дысцыплін спецыялізацый і іншых, сярод якіх цыкл мастацтвазнаўчага профілю — гісторыі музыкі, выяўленчага мастацтва, тэатра, кіно — з'яўляецца адным з найбольш значных. Ён садзейнічае свабоднай арыентацыі студэнта ў відах і жанрах мастацтва, у творчасці іх прадстаўнікоў, творчых напрамках, стылях, мастацкіх школах. Будучаму мастацтвазнаўцу прывіваецца ўменне аналізаваць творы мастацтва, свабодна арыентавацца ў культуралагічнай прасторы розных эпох, карыстацца спецыяльнай літаратурай па гісторыі мастацтваў.

Такім чынам, мастацтвазнаўца, а яшчэ шырэй — мастацтвазнаўца-педагог, — прафесія, якая абавязвае да многага. Яна патрабуе інтарэсу не толькі да мастацтва ва ўсіх яго відах і жанравай разнастайнасці, але і да кніг па мастацтве, а таксама здольнасці арыентавацца і ў абранай галіне мастацтва, і ў агульнагуманітарнай, сацыяльнай, філасофска-эстэтычнай сферах, ведаў літаратуры і замежных моў.

У гэтым амаль неабсяжным шэрагу ведаў і навыкаў, што атрымлівае будучы спецыяліст па сусветнай і айчыннай мастацкай культуры, цыкл музычных гісторыка-аналітычных дысцыплін (напрыклад, гісторыі музычнай культуры ў сукупнасці з аналізам выдатных помнікаў музычнага мастацтва) займае не апошняе месца.

Як вядома, вывучэнне гістарычных дысцыплін фарміруе гістарычнае мысленне студэнтаў, узбагачае іх духоўны свет. Не навіна і тое, што прынцып гістарызму заўсёды застаецца "краевугольным каменем" навуковага пазнання, а яго сутнасць можна вызначаць як разгляд фактаў або падзей у паступовым руху. У гэтай сувязі вывучэнне музычнай культуры з пункту гледжання гістарычна абумоўленых з'яў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што ў ёй адбываюцца разам са зменай мастацкіх эпох, садзейнічае найбольшай эфектыўнасці працэсу навучання і пазнання, абумоўлівае якасную падрыхтоўку спецыяліста.

Неабходна падкрэсліць, што праблему курса музычна-гістарычных дысцыплін востра ставілі яшчэ ў час фарміравання вышэйшай музычнай педагогікі. Першыя крокі ў гэтым накірунку былі зроблены А.Сяровым ("Аб гісторыі музыкі як вучэбным прадмеце"), Г.Ларошам ("Аб гістарычным вывучэнні музыкі"), М.Кашкіным ("Запіска") і іншымі вучонымі XIX ст. Яны падыходзілі да гісторыі развіцця музычнага мастацтва перш за ўсё як да арганічнай часткі агульнага развіцця мастацкай культуры. Шмат увагі надавалася пытанням музычна-гістарычнай адукацыі, яе значэнню ў пачатку 1920-х гадоў (даклады В.Брусава і Б.Яворскага, артыкулы і выступленні Б.Асаф'ева ("Выбраныя артыкулы аб музычнай асвеце і адукацыі"), К.Кузняцова, якія лічылі неабходным уключэнне "гісторыі музыкі ў агульны ланцуг гісторыка-культурных заканамернасцей"). Сярод сучасных аўтараў можна назваць Ю.Келдыша ("Яшчэ аб выкладанні гісторыі музыкі"), М.Пекліса, Г.Бакшчаніну, М.Друскіна і інш.

Аднак нягледзячы на акцэнты, зробленыя ў публікацыях на гэтую тэму, у педагагічнай практыцы спецыфіка навучання гістарычным музычным дысцыплінам часам зводзілася да вывучэння музычных стыляў, напрамкаў, індывідуальнай кампазітарскай творчасці, яна не разглядалася ў ракурсе ўключэння музыкі як арганічнай часткі ў мастацка-культурнае асяроддзе.

На спецыяльнасці "сусветная і айчынная мастацкая культура" дысцыпліны музычна-гістарычнага цыкла вывучаюцца перш за ўсё як гісторыя сусветнай і айчыннай музычнай культуры. Гэта дазваляе сфарміраваць музычна-гістарычнае мысленне студэнтаў для ўспрымання і ацэнкі канкрэтных з'яў гісторыка-культурнага мінулага. Не асобныя, няхай нават буйныя кампазітарскія імёны, не асобныя, нават значныя музычныя творы аказваюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"цэнтрам прыцягнення" ў працэсе выкладання музычна-гістарычных дысцыплін, а разнастайнае музычнае і культурнае жыццё краіны або рэгіёна (заходняга, рускага, беларускага) пэўнага перыяду.

Разам з тым курс гісторыі музычнай культуры пры ўсёй шырыні ахопу мае сваю спецыфіку: зварот да больш значных, агульных пытанняў абумоўлівае ігнараванне канкрэтных дэталей, што, безумоўна, садзейнічаюць глыбейшаму разуменню музычных твораў у іх гістарычнай узаемасувязі, у выяўленні іх стылістычных заканамернасцей, асаблівасцей музычнай мовы і сродкаў музычнай выразнасці. А гэта патрабуе ўзаемасувязі музычна-гістарычных прадметаў з дысцыплінамі аналітычнага характару, адной з якіх з'яўляецца аналіз помнікаў музычнай культуры. Праблему суадносін гісторыі і тэорыі ў рамках аднаго прадмета заўважыў яшчэ М.Г. Чарнышэўскі: "Без гісторыі прадмета няма тэорыі прадмета; але і без тэорыі прадмета няма нават думкі аб яго гісторыі, таму што няма ўяўлення аб прадмеце, яго значэнні і межах".

Спецыяльнасцю "сусветная і айчынная мастацкая культура" авалодваюць студэнты з рознай базавай адукацыяй: мастакі, музыканты, харэографы, тэатразнаўцы, акцёры. Таму аналітычны курс выкладаецца з мэтамі навучыць не толькі студэнта аналізаваць музычны тэкст, але і мысліць на мове мастацтва музыкі, што ўяўляе галоўную задачу пры вывучэнні цыкла музычна-аналітычных дысцыплін, які складаецца з двух узаемазвязаных блокаў — гістарычнага (лекцыйныя і семінарскія заняткі) і аналітычнага (практычныя і дробнагрупавыя заняткі).

На лекцыях па курсе сусветнай і айчыннай музычнай культуры студэнты атрымліваюць уяўленне аб перспектывах агульнага працэсу ў пэўны гістарычны перыяд (лекцыі агляднага характару), знаёмяцца з дасягненнямі нацыянальнага музычнага мастацтва (лекцыі — "стылявыя партрэты" эпохі, у тым ліку найбольш яркіх яе

прадстаўнікоў), вывучаюць гісторыю жанраў (лекцыі — жанравыя агляды). Лекцыі такога тыпу вельмі эфектыўныя і ў сінтэзе з гісторыка-стылявым партрэтам эпохі або вывучэннем творчасці кампазітараў дазваляюць прасачыць эвалюцыю і ў жанравай сферы, і ў стылістыцы. Часта жанравая накіраванасць лекцыі знаходзіць замацаванне на семінарскіх занятках, якія разам з практычнымі і дробнагрупавымі аказваюцца адной з дзейсных формаў развіцця ў студэнтаў самастойнасці мыслення, актыўнага інтарэсу да прадмета. На такіх занятках студэнты вучацца працаваць са спецыяльнай навуковай літаратурай, першакрыніцамі, даведачна-энцыклапедычнымі выданнямі і інш.

У сваю чаргу мэта аналітычных раздзелаў курса заключаецца ў тым, каб выявіць у музычным мастацтве адзінкавае, асобнае як адлюстраванне эпахальнага, агульнага праз непаўторна індывідуальнае ўвасабленне ў стылі кампазітара. Таму аналіз помнікаў музычнай культуры — перш за ўсё гістарычна асэнсаванае ўспрыманне музычнага мастацтва скрозь прызму канкрэтных музычных жанраў або твораў пэўнага стылю праз асваенне музычнай мовы, сродкаў музычнай выразнасці, прыёмаў формаўтварэння, тэматычнага развіцця, што ствараюць музычны вобраз. Дэталі марфалагічнай пабудовы музычнага твора, тэхналагічнага ракурсу пры яго вывучэнні дапамагаюць выявіць у ім найбольш грунтоўнае, раскрыць творчую задуму.

Падобны падыход да аналізу помнікаў музычнай культуры абумоўлівае прынцыпы методыкі правядзення заняткаў, заснаваныя на слыхавых вопыце і ўспрыманні музычнага твора, на выкарыстанні розных формаў гучання музыкі з наступным яе разборам.

Такім чынам, цыкл музычных гісторыка-аналітычных дысцыплін займае важнае месца ў падрыхтоўцы студэнтаў. Ён уяўляе варыятыўную распрацоўку дзяржаўнага стандарта вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці “сусветная і айчынная мастацкая культура”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ